

# МАСТАЦТВА РЭНЕСАНСА Ў БЕЛАРУСІ



Пра Рэнесанс на Беларусі і мастацтва яе старажытных гарадоў расказваюць дзве выстаўкі, якія запрашаюць мінчан і гасцей сталіцы. Абедзве яны размясціліся ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. Многія з прадстаўленых тут экспанатаў наведвальнікі ўбачаць упершыню. Скульптуры, іконы, жывапісныя партрэты, вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, рукапісныя кнігі — амаль усе яны знойдзены ў пасляваенныя гады. Гэтыя і іншыя знаходкі пераканаўча сведчаць пра багатую культуру старажытных гарадоў Беларусі IX—XIV стагоддзяў. Экспанаты для выстаўкі падрыхтавалі Дзяржаўны мастацкі музей БССР, Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, Дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна. Тут таксама дэманструюцца слайды, зробленыя ў Спаса-Прэабражэнскай царкве Заслаўя і Кафедральным саборы Вільнюса.

Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.





